**375.** Рашыце прыклады. Запішыце іх, замяняючы лікі словамі.

Узор: *50 + 20 = 70. Да пяцідзесяці дадаць дваццаць — будзе семдзесят.*

| | | |
|---|---|---|
| 60 + 20 = | 200 + 600 = | 300 × 2 = |
| 90 – 30 = | 900 – 400 = | 700 : 10 = |

**376.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Перакладзіце тэкст з рускай мовы на беларускую. Запішыце, замяняючы лікі словамі.

**Спринт**

Спринт — это совокупность легкоатлетических беговых дисциплин на короткие дистанции (до 400 метров).

В группу беговых видов легкоатлетической программы входит бег на дистанции протяжённостью до 400 метров, а также различные виды эстафетного бега. Бег на 100, 200 и 400 метров, эстафетный бег 4 × 100 метров и 4 × 400 метров включается в программу Олимпийских игр. Дистанции протяжённостью 30, 50, 60 и 300 метров включаются в соревнования в закрытых помещениях *(По К. Гусеву)*.

*Слоўнік*

протяжённость — *працягласць*
соревнование — *спаборніцтва*

Каго з беларускіх спартсменаў-бегуноў называюць Белай Маланкай?

## § 61. Састаўныя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс

**377.** Прачытайце табліцу. Зрабіце вывад пра асаблівасці скланення састаўных колькасных лічэбнікаў.

| Склон | Скланенне састаўнога колькаснага лічэбніка |
|---|---|
| Н. | *пяцьсот шэсцьдзясят сем старонак* |
| Р. | *пяцісот шасцідзесяці сямі старонак* |
| Д. | *пяцістам шасцідзесяці сямі старонкам* |
| В. | *пяцьсот шэсцьдзясят сем старонак* |
| Т. | *пяццюстамі шасцюдзесяццю сямю старонкамі* |
| М. | *(на) пяцістах шасцідзесяці сямі старонках* |



Правообладатель Национальный институт образования

Пры скланенні састаўных колькасных лічэбнікаў змяняецца кожнае слова.

**378.** Прачытайце тэкст. З якой мэтай у ім ужываюцца лічэбнікі?

Доўгі час самай вялікай ракой у свеце лічылася амерыканская[м] Місісіпі. Але вось ужо 2 стагоддзі вядома, што даўжыня Ніла складае 6671 кіламетр. Місісіпі ж ад вытоку Місуры — 6410 кіламетраў. Далей ідуць Амазонка — 6400 кіламетраў і Янцзы, даўжыня якой — 5800 кіламетраў *(Паводле А. Карлюкевіча)*.

Праскланяйце адзін з састаўных колькасных лічэбнікаў, ужытых у тэксце. Карыстаючыся прыведзенай у табліцы інфармацыяй, складзіце і запішыце невялікі тэкст (3-4 сказы) пра самыя вялікія рэкі Беларусі.

| Рака | Агульная даўжыня, км | Даўжыня па тэрыторыі Беларусі, км |
|---|---|---|
| Дняпро | 2145 | 690 |
| Заходняя Дзвіна | 1020 | 328 |
| Нёман | 937 | 459 |
| Прыпяць | 761 | 495 |

**379.** Утварыце і запішыце колькасна-іменныя словазлучэнні паводле прапанаваных схем. Абазначце ў словазлучэннях галоўнае слова.

Узор: 370 + *удзельнік* → Д. *тромстам сямідзесяці ўдзельнікам*.

284 + *экзэмпляр* → Р.

23 + *вагон* → Д.

516 + *грам* → Т.

802 + *старонка* → М.

**380.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і замяняючы лікі словамі.

1. Ц..пер за якія 3 хвіліны трэба было праплысці аж 150 метраў *(М. Лупсякоў)*. 2. Ікру рыбы а..кладваюць у в..лікай колькасці:



Правообладатель Национальный институт образования

аку́нь — каля 30 тыс..ч ікрынак[с], плотка — да 100 тыс..ч, карась — да 300 тыс..ч, а карп — ад 200 да 500 тыс..ч *(В. Вольскі)*. 3. Каб можна было, я праседжваў бы за кніжкамі ўсе 24 гадзіны *(З. Прыгодзіч)*. 4. Дзеду было гадоў 65: бела..усы, худы, з ружовай лысінай, з жоўтым пухам вакол, якраз дз..мухавец *(З. Бядуля)*.

Вызначце склон ужытых у сказах лічэбнікаў.

У якіх сказах колькасна-іменныя словазлучэнні абазначаюць прыблізную колькасць?

***Звярніце ўвагу!***

Каб перадаць значэнне **прыблізнай колькасці**, выкарыстоўваюцца:

- адваротны парадак слоў (назоўнік ужываецца перад лічэбнікам): *чалавек трыццаць, метраў дзвесце*;
- два лічэбнікі: *шэсць-сем тыдняў, дзесяць-пятнаццаць крокаў*;
- спалучэнне лічэбніка з прыназоўнікамі ***пад, з, за, каля, да***: *пад восемдзесят гадоў, каля дзвюх гадзін*;
- спалучэнні ***больш (менш) як, больш (менш) за, больш (менш) чым*** з лічэбнікамі ў вінавальным склоне: *больш за дваццаць гадоў, менш чым пяцьдзясят працэнтаў*.

**381.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

«Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў» — плён працы Міхася Канстанцінавіча Клышкі. Першае выданне слоўніка выйшла ў 1976 годзе. Праз 17 гадоў пабачыла свет другое, выпраўленае і дапоўненае, выданне. У 2005 годзе выйшла трэцяе выданне слоўніка, які мае ўжо гістарычную каштоўнасць.

Слоўнік уключае 1900 сін..німічных радоў. У ім сабрана 11 000 слоў і выразаў. У якасці іл..юстрацыйнага матэры..лу выкарыстаны прыклады з маста..кай літ..ратуры (творы 150 беларус..кіх піс..меннікаў), а таксама з фальклор..[л], перы..дычных і даведачных выдан..яў *(Паводле У. Сіўчыкава)*.


Правообладатель Национальный институт образования

Ахарактарызуйце ўжытыя ў першым абзацы тэксту лічэбнікі паводле значэння і будовы.

Адрэдагуйце другі абзац тэксту так, каб перадаць значэнне прыблізнай колькасці. Запішыце, замяняючы лікі словамі і ўстаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

У «Слоўніку сінонімаў і блізказначных слоў» М. Клышкі прыводзіцца наступны сінанімічны рад: *важнасць, значэнне; вага, сіла, ... , вастрыня (перан.).* Якое з ужытых у тэксце слоў прапушчана ў гэтым радзе?

**382.** Разгледзьце малюнак.




Складзіце і запішыце рэцэпт гатавання грэчкі па-купецку, ужываючы простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі.

## § 62. Скланенне, ужыванне і правапіс парадкавых лічэбнікаў

**383.** Прачытайце пары лічэбнікаў. Ад якіх лічэбнікаў утвараюцца парадкавыя лічэбнікі?

| | |
|---|---|
| чатыры — чацвёрты | шэсцьдзясят — шасцідзясяты |
| сямнаццаць — сямнаццаты | трыста — трохсоты |

Адзін з прыведзеных парадкавых лічэбнікаў спалучыце з назоўнікамі *год*, *старонка*, *аддзяленне*. Запішыце ўтвораныя словазлучэнні, вызначце род, лік і склон лічэбнікаў.

Большасць парадкавых лічэбнікаў утвараецца ад колькасных, якія абазначаюць цэлыя лікі. Выключэнне: *адзін — першы, два — другі.*

Парадкавыя лічэбнікі змяняюцца па родах, ліках, склонах, як прыметнікі.


Правообладатель Национальный институт образования